**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 па дысертацыі Старасценка Таццяны Яўгеньеўны
«Дынаміка беларускага мастацкага тэксту ХХ стагоддзя: лексіка-граматычныя сродкі, камунікатыўныя мадэлі і іх узаемадзеянне»

**1. Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца ступень.** Дысертацыя Старасценка Таццяны Яўгеньеўны «Дынаміка беларускага мастацкага тэксту ХХ стагоддзя: лексіка-граматычныя сродкі, камунікатыўныя мадэлі і іх узаемадзенне» адпавядае спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова, галіне навук – філалагічныя.

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў распрацоўку навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці.** Упершыню распрацавана і ўвасоблена канцэпцыя новага падыходу да разгляду камунікатыўнасці беларускага мастацкага тэксту, абгрунтаваны асаблівасці знешняй і ўнутранай дыялагізацыі паэтычнага і празаічнага дыскурсу. Вызначана семная арганізацыя звароткаў ва ўмовах паэтычнага кантэксту і рэпрэзентацыя слоўнікавых і кантэкстуальных сем у паэтычных ідыястылях; устаноўлены асацыятыўныя рады ключавых зваротка ў маналагічнага маўлення беларускага паэтычнага дыскурсу і іх роля ў арганізацыі тэкставай структуры і актуалізацыі чытацкага ўспрымання. Выяўлена сістэма бінарных канцэптаў і іх варыянтаў; ахарактарызаваны моўныя сродкі рэпрэзентацыі канцэптаў у залежнасці ад ідыястылю паэтаў і спецыфікі рэалізацыі ў сінтагматычным і парадыгматычным кантэксце. Прапанавана камунікатыўная арганізацыя імпліцытнага дыялогу аўктарыяльнага наратыву на ўзроўні камунікатыўных мадэлей; праведзена сістэматызацыя суб’ектаў камунікацыі дыегетычнага наратыву з выяўленнем іх рэферэнцыі ў залежнасці ад ідыястылю; разгледжана асаблівасць мадыфікацыі «я» ў дыялагічным па сутнасці маналогу. Сфарміравана тэарэтычная і практычная аснова новага напрамку камунікатыўнай стылістыкі мастацкага тэксту – дыялагічнай стылістыкі, якая вызначае перспектыўныя вектары асэнсавання асаблівасцей будовы мастацкага тэксту як дыялагічнага феномена.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджаецца вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый Д 01.42.03 хадайнічае перад ВАК Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні Старасценка Таццяне Яўгеньеўне вучонай ступені доктара філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

за вызначэнне спецыфікі дыялагізацыі мастацкага тэксту як асобай формы камунікацыі на аснове імпліцытнага дыялогу паміж пісьменнікам і чытачом у паэзіі і паміж унутрытэкставымі суб’ектамі прозы не толькі як змене сэнсавых пазіцый розных пунктаў гледжання, а і ўзаемадзеянні супрацьлеглых пазіцый аднаго суб’екта; ідэнтыфікацыю перспектыўных кірункаў сучаснай стылістыкі (стылістыка тэксту, стылістыка дэкадзіравання, камунікатыўная стылістыка мастацкага тэксту, дыялагічная стылістыка мастацкага тэксту) на аснове дыскурс-падыходу;

за распрацоўку дыялагічнага падыходу камунікатыўнай стылістыкі мастацкага тэксту «ад тэксту да чытача» («ад стымулу да рэакцыі») на аснове супастаўлення тэкставых асацыятаў зваротка ў розных часавых перыядаў; абгрунтаванне дынамікі знешняга дыялогу праз выяўленне слоўнікавых і патэнцыяльных сем зваротка як ядра асацыятыўна-сэнсавага поля ў залежнасці ад ідыястылю паэта і ўплыву экстралінгвістычных фактараў; стварэнне аўтарскай методыкі фарміравання тэкставых асацыятыўных радоў на аснове падыходу «ад тэксту да чытача»;

за выяўленне і тыпалагізацыю бінарных канцэптаў у дыялагічным падыходзе камунікатыўнай стылістыкі «ад чытача да тэксту» («ад рэакцыі да стымулу») на аснове паралелізму паэтычнай структуры з адносінамі супастаўлення і супрацьпастаўлення ў творах беларускіх паэтаў розных часавых перыядаў; выпрацоўку прыёмаў інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту на аснове кантрасту, эфекту падманутага чакання і з улікам уплыву граматычнага ўзроўню на семантычны; вызначэнне ролі парадыгматычнага кантэксту ў фарміраванні тэкставых асацыятаў канцэптаў на аснове падыходу «ад чытача да тэксту»;

за сістэматызацыю камунікатыўных мадэлей, якія рэпрэзентуюцца ў беларускім аўктарыяльным і дыегетычным наратыве ХХ ст. на аснове маналагічнага маўлення: «наратар – персанаж», «персанаж – персанаж», «аўтар – персанаж», «аўтар – наратар», “я – я”, “я – мы”, “я – ты (вы)”, “я – я”, “я – ён”; распрацоўку методыкі дыскурс-аналізу мадэлі аўктарыяльнага наратыву «персанаж – персанаж» з вектарным напрамкам ад мінулага да цяперашняга на аснове макрапрапазіцый; вызначэнне эксплікацыйнага плана інварыянтных мадэлей «аўтар – чытач» і «наратар – чытач» з выхадам на знешнюю дыялагізацыю;

за ўкараненне сістэмы прыёмаў стылістычнага аналізу ўзаемадзеяння ўнутрытэкставых камунікантаў мастацкага наратыву праз модусы ўспрымання, разважання, успаміну, змешаны (аўктарыяльны і дыегетычны) аповед, дзённікавую і эпісталярную формы; абгрунтаванне эфектаў супастаўлення і супрацьпастаўлення розных пунктаў гледжання празаічнага наратыву; выяўленне моўнай эксплікацыі супастаўленасці і супрацьпастаўленасці ў кожнай камунікатыўнай мадэлі аўктарыяльнага і дыегетычнага наратыву з улікам тыпаў адносін паміж моўнымі адзінкамі;

за вызначэнне рэпрэзентацыі камунікатыўных мадэлей аўктарыяльнага наратыву на аснове моўных і кампазіцыйных прыёмаў суб’ектывацыі, цытавання, устаўных канструкцый суб’ектыўнай мадальнасці, няпоўных займеннікаў як другасных эгацэнтрыкаў, прыёму нестандартнага ўспрымання, ацэначных формаў, трапеічных сродкаў, дыстантна размешчаных макрапрапазіцый з парадыгматычнай кагезіяй; устанаўленне эксплікантаў мадыфікацыі моўцы мадэлі «я – я» дыегетычнага наратыву.

**4. Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.** Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшага вывучэння праблем стылістыкі беларускай мовы, філалагічнага аналізу мастацкага тэксту, лінгвістычнага аналізу тэксту, псіхалінгвістыкі, кагнітыўнай лінгвістыкі, тэксталогіі, дыскурс-аналізу, літаратуразнаўства, тэорыі рэгулятыўнасці, тэкставых асацыятаў, сэнсавага разгортвання, ролі граматычных сродкаў мовы ў стварэнні камунікатыўнасці; у адукацыйным працэсе вышэйшай школы пры выкладанні стылістыкі беларускай мовы, сучаснай беларускай літаратурнай мовы, культуры маўлення, гісторыі беларускай літаратуры, тэорыі літаратуры; пры выкананні курсавых, дыпломных, магістарскіх работ і кваліфікацыйных даследаванняў і напісанні тэарэтычных і практычных дапаможнікаў па стылістыцы беларускай мовы і сумежных з ёй літаратуразнаўчых дысцыплінах, сучаснай беларускай літаратурнай мове, філалагічным аналізе тэксту.

Старшыня савета
па абароне дысертацый Д 01.42.03 — В. П. Русак

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Д 01.42.03 — Н. В. Паляшчук
20.02.2024